# НАШЫ АБРАДЫ, ТРАДЫЦЫІ, ЗВЫЧАІ

## СЦЭНАРЫЙ СВЯТОЧНАГА КАЛЯДАВАННЯ

Пры напісанні сцэнарыя аўтары ставілі перад сабой наступныя мэты: максімальна ўзнавіць тыя ўмовы, у якіх калісьці адбывалася ігравое дзеянне, захаваўшы, наколькі гэта магчыма, у недатыкальнасці фальклорны матэрыял.

Сцэнарый складзены перш за ўсё для вясковага гурта, які мае намер ажыццявіць святочны абход двароў сваіх аднавяскоўцаў. У прынцыпе гэта не выключае мажлівасці правядзення адзначанага свята і ў гарадскіх умовах. Праўда, каб яго правесці, патрэбны пэўныя арганізацыйныя намаганні, якія будуць разгледжаны ніжэй.

У наш час і прафесійныя, і самадзейныя калектывы, у тым ліку і вясковыя, праяўляюць творчую цікавасць да фальклору, традыцыйных свят. Звычайна фальклор, абрады выкарыстоўваюцца ў сцэнічных умовах або на канцэртных пляцоўках. Канешне, такая форма засваення народнай спадчыны вельмі неабходная і карысная. Але ж для захавання і развіцця традыцыйнай культуры важна аднаўленне яе вытокаў у штодзённым побыце.

Менавіта гэту задачу аўтары паставілі перад сабою пры рабоце над сцэнарыем, выкарыстаўшы асабісты вопыт правядзення каляднага свята ў якасці рэжысёра і музычнага кіраўніка з рознымі калектывамі Мінскага і Стаўбцоўскага раёнаў Мінскай вобласці і Светлагорскага — Гомельскай.

Трэба адзначыць, што працэс адраджэння некаторых абрадаў і звычаяў не можа праходзіць без страт, г. зн. яны не могуць адрадзіцца ў ранейшым выглядзе. Справа ў тым, што жыццёвыя ўмовы, у якіх існавала традыцыйная культура, значна змяніліся, як змяніліся і нашы ўяўленні аб эстэтыцы фальклору, пераасэнсаваліся самі крытэры прыгажосці.

Разглядаючы пытанне адраджэння традыцый у грамадскім асяроддзі, неабходна звярнуць увагу і на тое, што абрад, звычай заўсёды мае характэрныя мясцовыя асаблівасці.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Калі б аўтары абмежаваліся выкарыстаннем толькі той традыцыі, якая існавала ці існуе ў канкрэтным рэгіёне, то сцэнарый значна абяднiўся б, таму што шмат цікавага, асабліва ў ігравым дзеянні, песенным фальклоры, што ёсць у другіх мясцовасцях, не знайшло б свайго адлюстравання. Уключыўшы ў сцэнарый самы цікавы, каштоўны, разнастайны матэрыял, які апрабіраваны ў практычнай дзейнасці, апошні, на думку аўтараў, не супярэчыць выкарыстанню мясцовых элементаў абрада калядавання. Наадварот, пры правядзенні абрада калядавання ад спалучэння таго лепшага, што ўжо вядома, і таго невядомага, што існуе ў канкрэтнай вёсцы, мясцовасці або захавалася ў памяці людзей старэйшага ўзросту, выйграе толькі наша традыцыйная культура

Аўтары мелі на мэце даць такі сцэнарый, у якім знайшло б сваё адлюстраванне не толькі само тэатралізаванае дзеянне, але і методыка арганізацыі і правядзення разнастайных мерапрыемстваў, звязаных з падрыхтоўкай да калядавання. Практыка паказвае, што ад вырашэння неабходных арганізацыйных задач у вялікай ступені залежыць поспех адраджэння гэтага традыцыйнага свята.

Для яго правядзення неабходна стварыць арганізацыйны камітэт або ініцыятыўную групу, куды пажадана ўключыць прадстаўнікоў грамадскасці, знаўцаў народнай спадчыны, актывістаў з вясковай моладзі, наогул зацікаўленых людзей, якія неабыякава ставяцца да лёсу нашай культурнай спадчыны.

У арганізацыйны савет абавязкова павінен уваходзіць той, хто непасрэдна рыхтуе свята. Як правіла, гэта рэжысёр або асоба, якая ажыццяўляе гэтую ролю, а таксама музыкант (настаўнік музычнай школы, баяніст ДК, кіраўнік самадзейнага калектыву, які валодае музычным інструментам).

Ініцыятыўная група павінна правесці ўсю падрыхтоўчую работу: пагутарыць з грамадскасцю пра Каляды, праінфармаваць насельніцтва аб маючым адбыцца свяце, пазнаёміць калядоўшчыкаў з зімовымі традыцыямі беларусаў, дапамагчы калектыву ў стварэнні касцюмаў калядных персанажаў, вырабе каляднай сімволікі, падрыхтоўцы вогнішча і інш. Карацей кажучы, для паспяховага правядзення каляднага абходу двароў трэба пачаць падрыхтоўку загадзя і аднесціся да гэтага з усёй сур'ёзнасцю. На практыцы, на жаль, адбываецца інакш: хочуць зрабіць за два тыдні тое, ча што трэба затраціць 3—4 месяцы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паколькі абход калядоўшчыкамі двароў ужо існуе не ў многіх месцах Беларусі, трэба загадзя паклапаціцца аб згодзе гаспадароў 3—4 дамоў на прыняцце каляднага гурта, пры гэтым пажадана вызначыць такія хаты, якія мелі б прастору для паказу тэатральнага відовішча. У гарадскіх умовах асабліва важна загадзя дамовіцца аб наведванні калядным гуртом той або іншай кватэры, каб ні для калядоўшчыкаў, ні для гаспадароў не было нечаканасцей. Гаспадары могуць своечасова падрыхтавацца да прыёму гасцей, пасля прадстаўлення пачаставаць удзельнікаў пернікамі, цукеркамі, падараваць ім што-небудзь, палажыць сёе-тое механошы.

У наш час людзі адарваліся ад традыцыйнай культуры сваіх бацькоў, таму няма ніякага сораму і нетактоўнасці ў тым, каб падрыхтаваць гаспадароў да прыходу калядоўшчыкаў. Наадварот, для адраджэння народных абрадаў і звычаяў неабходна свядомае і зацікаўленае заахвочванне ўсіх, хто неабыякавы да традыцыйнай культуры.

Толькі вырашыўшы ўсе неабходныя задачы па правядзенні свята, можна быць упэўненым, што яно пройдзе сапраўды цікава і пакіне добрае ўражанне ва ўсіх, хто меў да яго дачыненне.

Аўтары лічаць мэтазгодным даць кароткія звесткі аб народным зімовым святе Каляд, а таксама калядных персанажах, іх функцыянальнай ролі, сімволіцы свята і інш.

Беларускія народныя святы, як і наогул святы ўсходніх славян, утварыліся на аснове аграрнага календара. Ля вытокаў народных свят ляжыць праца чалавека, яго гістарычны вопыт, жыццёвыя назіранні над прыроднымі з'явамі. У далёкім мінулым чалавек не пасіўна ўспрымаў рэчаіснасць, а імкнуўся неяк уздзейнічаць на акаляючы свет, падпарадкаваць яго сілы сваім мэтам.

Народныя каляндарныя святы павінны былі, на думку нашых прашчураў, забяспечыць неабходныя ўмовы для іх жыццядзейнасці. Па сваму характару яны мелі пераважна магічны сэнс.

Беларускія Каляды праводзіліся зімой, калі сонца паварочвала на лета і дні станавіліся даўжэйшымі, па новаму стылю — з 6 па 19 студзеня, па старому — з 25 снежня па 6 студзеня.

На працягу двух тыдняў забараняліся некаторыя работы, а вечары ў гэты час называліся святымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод розных калядных абрадавых дзеянняў хаджэнне калядоўшчыкаў таксама мела на мэце паспрыяць будучаму ўраджаю — аснове дабрабыту сялянскай сям'і.

Сёння нас не цікавіць утылітарны аспект каляднага абраду, таму што ён страціў сваю былую функцыю. Важна другое — усе абрадавыя дзеянні заключаюць шмат мастацкіх, паэтычных, эстэтычных элементаў, увасабляючы якія ў тэатральным відовішчы, падрастаючае пакаленне пазнае гісторыю свайго народа, далучаецца да здабыткаў роднай культуры.

У калядны гурт уваходзяць наступныя персанажы:

З в я з д а р са звядою,
Д з е д-п а ч ы н а л ь н і к,
К а з а,
К а б ы л а,
Ж о р а ў,
М я д з в е д з ь,
Ц ы г а н,
М а л а д з і ц а,
Л е к а р,
М е х а н о ш а,
М у з ы к і.

Спачатку вызначым некаторыя функцыі асноўных персанажаў каляднай «світы» і дадзім кароткія парады наконт падрыхтоўкі касцюмаў.

Адной з важных дзеючых асоб з'яўляецца «каза», прыход якой да гаспадароў павінен быў забяспечыць урадлівасць і пладавітасць:

Дзе каза ходзіць —
Там жыта родзіць,
Дзе не бывае —
Там вылягае...

Падрыхтаваць касцюм «казы» нескладана: трэба вывернуць кажух поўсцю наверх, затым надзець адзін рукаў на канец дугі, паставіўшы яе выпукласцю ўніз. Пасля гэтага трэба завязаць гэты рукаў так, каб атрымалася нешта накшталт галавы і шыі і прымацаваць да галавы рогі з саломы. З саломы рыхтуюць таксама і хвост, які прымацоўваецца да другога канца дугі. Выканаўца залазіць пад кажух і, узяўшы канец дугі з галавой, становіцца «казой».

«Мядзведзь», якога водзяць з сабою калядоўшчыкі, увасабляе здароўе і багацце сям'і. Робіцца ён наступным чынам: рукавы аднаго вывернутага кажуха надзяваюць на рукі, другога — на ногі. Затым сшываюць альбо падвязваюць ніз і по-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лы кажухоў вяроўкай, на галаву надзяваюць чорную шапку і твар вымазваюць чорнай фарбай. Мядзведзя вядзе важак, трымаючы ў руках доўгі кій.

Спадарожнікам «мядзведзя» з'яўляецца «жораў». Спачатку трэба зрабіць птушыную галаву і прымацаваць яе да доўгай палкі. Пасля гэтага трэба прывязаць да яе шырокае футра або сабраную ў зборкі прасціну. Выканаўца, схаваўшыся пад ёй, доўгай дзюбай, нібы незнарок, б'е гледачоў і сваімі ўчынкамі забаўляе іх.

«Кабылу» можна зрабіць так: узяць палку (прыкладна 1,5 м) і замацаваць на яе канцах зробленыя загадзя два кальцы з гнуткага драўлянага прута (кожны пасярэдзіне палкі). Пасля гэтага трэба зрабіць спераду галаву з вушамі, а ззаду хвост з ільну. Затым падрыхтаваны каркас накрываюць якой-небудзь доўгай посцілкай-саматканкай. Выканаўца павінен знаходзіцца ўнутры корпуса «кабылы». У час прадстаўлення цыган дэманструе розныя выкрутасы з кабылаю. Апрануты ён у сіні армяк, падпяразаны вяроўкай, на галаве — падраная шапка.

«Афіцэр» прыбраны ў вайсковы мундзір і штаны. Праз яго плячо завязана блакітная лента з паперы, а на галаве надзеты папяровы ківер з султанам.

Для ролі маладзіцы трэба падабраць шчуплага хлапчука, апрануць яго ў жаночую кашулю з рукавамі і ў андарак, на шыю павесіць маністы, а на галаву завязаць хустку.

«Лекар» апрануты ў белы халат, на носе — вялікія акуляры, зробленыя з гнуткага дроту, на галаве — модны картуз.

Адзін з удзельнікаў павінен выконваць ролю дзеда-пачынальніка. Яго апранаюць у вывернуты кажух, робяць на спіне горб, надзяваюць маску, прывешваюць ільняную бараду. У адной руцэ ён трымае табакерку, у другой — доўгі кій.

Роля дзеда-пачынальніка — адна з самых адказных, таму што ён з'яўляецца галоўным «дырыжорам» каляднага гурта. Звычайна ў народзе на гэтую ролю падбіралі гаваркога хлопца.

Пры стварэнні вышэйапісаных касцюмаў каляднага гурта перад удзельнікамі адкрываецца шырокі прастор для майстэрства і фантазіі. Дарэчы, у народзе, па назіраннях даследчыкаў фальклорнай творчасці, яны існавалі заўсёды.

Але няма нічога дрэннага і ў тым, калі выкарыстоўваюцца спецыяльна зробленыя касцюмы «казы», «мядзведзя», «афіцэра» і г. д. Аднак жа не ўсе жадаючыя маюць магчымасць іх



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

набыць. У гэтым выпадку яны павінны самі падрыхтаваць неабходную атрыбутыку.

Для правядзення калядавання трэба таксама загадзя падрыхтаваць вогнішча, вызначыўшы месца для яго (на плошчы, стадыёне, якім-небудзь шырокім месцы).

І вось неабходная работа па правядзенню калядавання зроблена. Калядны гурт збіраецца ў вызначаны дзень каля 17 гадзін. Удзельнікі яго апранаюць касцюмы, праводзяць апошнюю кароткую рэпетыцыю. Выйшаўшы на вуліцу, яны накіроўваюцца па запланаванаму маршруту. Наперадзе ідзе звяздар са звяздою, астатнія рухаюцца за ім, спяваючы ў час руху калядную песню «Пасхала каляда з канца ў канец» (гл. Дадатак).

Падышоўшы да хаты (кватэры), адзін з удзельнікаў — гаваркі хлопец — стукае ў дзверы (або націскае кнопку званка). Атрымаўшы дазвол, ён заходзіць у памяшканне і гаворыць: «Дзень добры ў хату!» Пачуўшы адказ, прадаўжае: «Іду ад пана нашага. Ідучы пытаю, што сказаці маю свайму пану Году, што носіць бароду, шырокую, як лапату, сіву і касмату. Ці шырокі лавы, каб нам паляжаці? Ці добра гаспадыня, каб нас частаваці?»

— Адкуль вы? — пытаецца гаспадыня.

— Мы людзі не простыя, з далёкага краю, хлопцы ўсе сталыя, з-пад самага раю.

— Адкуль ідзяце?

— Ідзём кругом света, аж ад пана Лета. Мы к лету ідзём, казу вядзём і радасць нясём,— адказвае калядоўшчык.

— Дык просім у хату,— запрашае гаспадыня.

(Для таго, каб гаспадыня з поспехам выканала сваю «ролю», ёй неабходна загадзя паведаміць пра пытанні.)

Атрымаўшы дазвол, удзельнік запрашае калядоўшчыкаў у хату.

Першым заходзіць дзед-пачынальнік, які вядзе за сабой «казу», потым «цыган» з «канём», «маладзіца» з «афіцэрам», музыкі, механоша і ўся світа. «Каза» становіцца пасярэдзіне хаты, разам з ёю «цыган» з «канём», «мядзведзь» з «важаком», «маладзіца» з «афіцэрам». Астатнія ўдзельнікі стаяць у парозе.

Д з е д-п а ч ы н а л ь н і к.— Добры вечар, пане гаспадар! Ці вольна паспяваці да й павесяліці?

Г а с п а д а р.— Вольна, паспявайце!

Пасля музычнага ўступу ўсе спяваюць «Добры вечар вам!».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У час прадстаўлення «жораў» ходзіць па хаце і стараецца дзеўбануць каго-небудзь з прысутных.

Д з е д-п а ч ы н а л ь н і к.

Паехала каляда з канца ў канец,
Каляда, калядзіца ж мая!
Зайшла каляда к Андрэю* на двор:
— Пане Андрэй, чым даруеш каляду,
Каляду, калядзіцу ж маю?

Пасля гэтых слоў дзеда-пачынальніка гурт спявае прывітальную песню гаспадару «Добры вечар таму...»

Дачакаўшыся заканчэння песні, дзед-пачынальнік стукае некалькі разоў кіем у падлогу. Гэтыя стукі з'яўляюцца сігналам для музыкаў. Яны пачынаюць іграць песню «Го-го-го, каза». Пад музычны ўступ «каза» пачынае пераступаць з нагі на нагу ў рытме песні. На працягу яе «каза» танцуе і стараецца праілюстраваць сваімі дзеяннямі тое, аб чым спяваецца ў песні.

Калі песня заканчваецца, «каза» прыкідваецца мёртвай, затым устае. Дзед бярэ казу за шыю, падводзіць да гаспадара, гаспадыні, іншых членаў сям'і і кажа: «Ну-ка, каза! Стань, расхадзіся, пану хазяіну пакланіся!» Затым дзед падводзіць «казу» да гаспадыні са словамі: «Пані хазяйцы пакланіся, каб ласкава была, унесла каўбасу і кусок сала, каб каза весялей стала!»

— Дзе вы гэту казу дасталі? — пытаецца гаспадар.

— На кірмашы ад старога купіў,— адказвае дзед.— Семсот грошай заплаціў.

— А дзе сам так вывучыўся?

— Па ўсім свеце ходзячы, торбу хлеба носячы, між людзей бываючы, дзівы дзіўныя відаючы, розныя кнігі чытаючы, уверх нагамі іх трымаючы. А вы здаровы бывайце ды праз год нас чакайце,— кажа дзед.

Пасля выступлення «казы» дзед звяртаецца да «маладзіцы» і «афіцэра» са словамі: «Ну, пагуляйце-тка вы!»

Музыкі пачынаюць граць «Барыню». Закончыўшы танец, «маладзіца» і «афіцэр» пад ручку адыходзяць убок.

На сярэдзіну хаты выходзіць «цыган» з «канём». «Цыган» стукае два-тры разы бізуном аб падлогу, і «конь» пачынае га-

* Называецца сапраўднае імя гаспадара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лопам рухацца па кругу. «Цыган» пачынае прыставаць да гаспадара і гледачоў.

— А ну, хазяін, ці няма памяняць на коней? Мая сівая як бяжыць — зямля дрыжыць, а паваліцца — ляжыць!

На гэтых словах кабыла валіцца на падлогу. «Цыган» зноў звяртаецца да гаспадара:

— Памажы падняць!.. Ну, дак будам мяняць? Я цыган багаты: у мяне ў адным кармані вош на аркані, а ў другім — блаха на цапу!

У гэты час нехта з удзельнікаў узрушана кажа: «Лекара, дзе лекар?»

На сярэдзіну круга важна выходзіць лекар, абыходзіць, не спяшаючыся, «кабылу», затым адчыняе свой чамадан, бярэ ў руку трубку ці цыбуліну накшталт слыхавога апарата. Потым, прыставіўшы яе да галавы «кабылы», быццам уважліва слухае. Затым дастае бутэльку з нейкай вадкасцю і нібыта налівае ёй у рот. «Кабыла» падымаецца, але потым зноў валіцца. «Цыган» некаторы час ганяецца за «лекарам» са словамі: «Ашуканец, ашуканец, лавіце яго!» Не дагнаўшы «лекара», «цыган» падыходзіць да «кабылы», тармосіць яе за повад. «Кабыла» ўстае. «Цыган» падводзіць яе да гаспадара: «За ету чэсць давай, хазяін, карбаванцаў шэсць і тры кускі сала, штоб наша кабыла не прыстала!» Атрымаўшы пачастунак ад гаспадара, «цыган» з «кабылай» адыходзяць убок.

Затым на сярэдзіну круга выходзіць важак з «мядзведзем» і кажа: «Кланяюся нізка ўсім, і Мішка таксама кланяецца («мядзведзь» ківае галавою).— Ну-ка, Міша, пакажы нам, як бабы хлеб месюць!» («Мядзведзь» паказвае.)

— Ну-ка, Міша, пакажы чэснай публіцы, як мужык Янка п'яны з кірмашу дамоў вяртаецца? («Мядзведзь» паказвае, перакульваючыся з нагі на нагу.)

— Так, так, Міхаіл, весялей, весялей — мужык Янка добрых дзве кварты выпіў, і таму ног пад сабой не чуе! («Мядзведзь» паказвае, як ходзіць зусім п'яны чалавек.)

— Ну, Міша, за старанне трымай мядовы пернік. Пернікі любіш? (Дае пернік «мядзведзю».)

— Ну-ка, Мішанька, паскач харашэнька — ета табе не пчолак драць... («Мядзведзь» выконвае танец мядзведзя.)

— Ну, Міша, апускайся на ніз! Падзякуй усім гаспадарам ды пойдзем далей. («Мядзведзь» кланяецца і разам з важаком адыходзіць убок.)

На сярэдзіну круга выходзіць дзед:

Ой, там на гары пеўнічак пяе,
Добры вечар!
Пеўнічак пяе, Васілька* ўстае,
Васілька ўстае, да стаенкі ідзе,
Да стаенкі ідзе, коніка вядзе.

Пасля гэтых слоў гурт спявае прывітальную песню «А ў полі, полі». Дачакаўшыся, калі песня будзе спета, дзед зноў выходзіць на сярэдзіну хаты і звяртаецца да гаспадара:

Ой, ішла калядка калядуючы праз сяло,
Зайшла ж яна да пана Сцяпана** пад акно:
— Ой, пане Сцяпане, харошыя дочкі ў цябе!

Спяваецца прывітальная песня дачцэ гаспадароў «У лузе каліна вясну скрасіла».

Дзед звяртаецца да гаспадара:

— А ну, барджэй, не баў гасцей!
Механошу — копу грошы***,
Падхватнічкам — па цукерачцы,
Па цукерачцы, кілбасу на талерачцы.
Пачынальніку — чырвон злоты.
Ад кошачкі — сала трошачкі,
Ад кароўкі — чвэрць палоўкі,
Ад коніка — бочка солі,
Ад авечкі — рэшата грэчкі,
Ад свінкі — шрот саланінкі.

Атрымаўшы пачастункі, усе крычаць:

Які гэта піражок — каб гэтакі каласок,
А з таго каласочка — жыта бочка!
А за гэты кусок сала — каб свіння дзверы выстаўляла.

Пакідаючы хату, усе спяваюць віншавальную песню «Будзь ваша здароў».

Закончыўшы выступленне, калядоўшчыкі ідуць да другой хаты. Практыка паказвае, што гэтую праграму магчыма паказаць за адзін вечар 2, максімум 3 разы, таму што болей фізічна вельмі цяжка.

Пасля выступленняў у хаце, гурт рухаецца з песнямі да пляцоўкі, дзе падрыхтавана вогнішча. Па дарозе ўдзельнікі

---

* Называецца сапраўднае імя сына гаспадара.

** Называецца сапраўднае імя гаспадара.

*** Тут і далей другую палову страфы гавораць усе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спяваюць песні «На новае лета», «Ой, калядныя бліны ладныя» і інш.

Запаліўшы дровы, калядоўшчыкі водзяць вакол вогнішча карагоды, танцуюць розныя танцы, праводзяць гульні. Прапануем карагод «У карагодзе мы былі», танцы «Цыганачка», «Падэспань», «Полька», «Прыпеўкі» (варыяцыі на народныя тэмы). Большасць прадстаўленых апрацовак можна выконваць не толькі на баяне, але і на гармоніку, што пашырае магчымасць іх выкарыстання.

Што датычыць пазаабрадавых калядных гульняў, то жадаючыя могуць знайсці іх у кнізе «Народны тэатр» (Мн., 1983. С. 159—160, 162—165, 168—170).

## Абрады завяршэння каляд

Даследаванні апошніх гадоў даюць права гаварыць, што ў старажытныя часы на тэрыторыі Беларусі існавалі абрады завяршэння каляд, якія праводзіліся на паветры і якія можна выкарыстаць і зараз. Так, у Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці існуе такі звычай. У апошні калядны вечар моладзь збіраецца ля вогнішча, на якім паляць старызну. На слупе ўстанаўліваюць кола ад воза. Хлопцы па чарзе лезуць на слуп і спрабуюць зняць кола, якое затым кідаюць у вогнішча.

У гэтым абрадзе ярка прасочваюцца рэшткі язычніцкай славянскай абраднасці. Голы слуп сімвалізуе сабой мёртвае дрэва, а кола — гадавы круг. Стары год закончыўся, і яго трэба скінуць, спаліць старое і даць магчымасць нарадзіцца новаму году. Палаючае вогнішча як бы дапамагае растапіць снягі і прыдаць сілы сонцу хутчэй прыйсці на зямлю.

У сучасным выкананні гэты абрад страціў былы магічны сэнс і праводзіцца як забава, якая можа стаць адной з адметных рыс беларускага каляднага свята.

У Бярэзінскім, Стаўбцоўскім, Валожынскім і Дзяржынскім раёнах да нядаўняга часу існаваў абрад «цягнуць каляду на дуба». Пад словам «каляда» ў гэтым абрадзе маецца на ўвазе гаршчок з куццёй, які ставілі на барану, усланую саломай хлебных раслін.

Гэты абрад меў наступны змест: пасля калядных абходаў вёскі і гульняў калядоўшчыкі збіраліся ля адной з хат і на конях, павозках або пешшу ішлі да дуба, які рос за вёскай. Праз адну з яго галін перакідвалі вяроўку і ўзнімалі да сонца барану з куццёй. Потым разводзілі вогнішча, вадзілі караго-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ды, ладзілі гульні, а ў канцы гаварылі: «Вось і ўсё! Каляду на дуба зацягнулі — і свята закончылі!»

У гэтым абрадзе таксама прасочваюцца культ Сонца і раслін, матывы гаспадарчых клопатаў людзей, адлюстраваныя ў старажытным свяце зімняга сонцастаяння. Куццю можна разглядаць як своеасаблівую ахвяру Сонцу. Людзі імкнуліся яго задобрыць, надаць яму моц праз агонь, каб Сонца хутчэй прыйшло на зямлю.

Цяпер былы сэнс у гэты абрад ужо не ўкладваюць, і абрад «цягнуць каляду на дуба» ў Бярэзінскім раёне — гэта маляўнічая, прыгожая дзея каляднага святкавання.

Мы лічым, што абрады, уключаныя ў сённяшнія каляды, могуць надаць беларускаму зімоваму абрадаваму комплексу нацыянальны каларыт і мясцовую своеасаблівасць, узбагаціць наша беларускае свята новымі знаходкамі. Разам з тым мы прапануем культасветработнікам правесці даследчую работу ў сваіх раёнах. Можа дзе яшчэ зберагліся ў народнай памяці абрады завяршэння каляд? Калі вашы пошукі завершацца паспяхова, то каляднае свята ў вас набудзе яшчэ большы мясцовы каларыт.

Наша практыка правядзення каляднага свята ў розных рэгіёнах Беларусі сведчыць, што людзі прымаюць актыўны ўдзел у яго правядзенні. Звычайна свята заканчваецца позняй ноччу.

### Выкарыстаная літаратура

Беларускі фальклор у сучасных запісах. Мн., 1989.
Гурскі А. І. Зімовыя песні: Калядкі і шчадроўкі. Мн., 1975.
Народны тэатр. Мн., 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ